Второй основан на здравом смысле, который поддерживают Верховный Совет, правительство и абсолютное большинство нашего народа. Это построение демократического, правового государства, в котором человек должен занимать первостепенную роль. Такое государство исключает насилие над личностью. В таком государстве идея национального самосознания овладевает обществом на принципах исторической правды, соответствия политического курса власти и желания большинства людей.

Я думаю, никто не будет отрицать, что за период после обретения республикой независимости и образования СНГ правительству приходилось решать целый ряд труднейших задач различного характера. Необходимо было предельно сократить социальные потери, обеспечить духовную, гуманистическую, нравственную направленность преобразований, уравновешенность интересов народа Беларуси с интересами народов СНГ и мирового сообщества в целом. Именно поэтому мы отстаивали и будем отстаивать курс постепенных осмысленных реформ, вектор которых направлен не в ущерб, а во благо общества.

На динамику происходящих у нас изменений заметное влияние оказывали события и ситуации, возникающие в новых независимых государствах и прежде всего в России. Нас так же, как и россиян, беспокоят проблемы гражданского мира, национального согласия. Мы прекрасно понимаем, что, если бы Россия отвергла путь интеграции с государствами СНГ, то это неизбежно привело бы к тяжелейшим политическим и экономическим потрясениям не только в странах Содружества, но и в самой России.

Осмысление подобных угроз гражданскому миру происходит не только у нас. Поэтому не случайно наши идеи об экономическом союзе, единой денежной системе наконец-то стали предметом серьезных переговоров с правительством России, привлекли внимание других независимых государств и были поддержаны в недавнем послании Президента Российской Федерации.

Приятно отметить, что и в рамках СНГ постепенно, но все более уверенне на смену отчужденности, экономической дезинтеграции, так называемой коммунальной суверенизации приходят доверие, понимание общих геополитических интересов, необходимости согласованной политики в сфере промышленного и аграрного производства, кредитно-денежных отношений, банковского дела, инвестиций и финансов.

Основным внешнеполитическим приоритетом Беларуси безусловно являются отношения с Российской Федерацией.

В этом наш обоснованный исторический выбор. Его безальтернативность заключается в общности белорусско-российской культуры, единых интересов двух братских народов, в глубокой интеграционности, недавней общности промышленного потенциала и коммуникационного пространства.

Отвечая подобной аргументацией некоторым критикам внешнеполитического курса белорусского правительства, хотел бы еще раз заявить, что Беларусь неуклонно идет по пути реформ, строит демократическое общество, суверенное правовое государство, открытое для диалога со всеми дружески настроенными по отношению к нам странами.

Убежден, что мы понимаем важность переживаемого нашей республикой исторического момента и не можем согласиться с тем, чтобы в государственной политике национализм и экстремизм взяли бы верх над разумом, права и свободы личности ставились бы в зависимость от национальной принадлежности. Сегодня уже недопустим политический монополизм одной партии, выступающей от имени всего народа в роли оракула. Наше общество, особенно за последние годы, получило прекрасное политическое образование и хорошо разбирается в словесной риторике. Люди хотят не политической трескотни и обещаний, а реального улучшения жизни, справедливости и защиты со стороны государства от нарастающей преступности.

Сильная государственная власть, пользующаяся доверием народа, это главное условие выхода республики из экономического кризиса. Сейчас мы убедились, что при структурной переориентации недопустим уход государства от управления экономическим развитием.

Абсурдно считать, что в республике, где абсолютное большинство предприятий и почти весь аграрный комплекс государственные, реформы можно провести в короткий срок, стихийно, без участия самого государства. Управляемость этим сложным процессом — пожалуй, основное условие постепенного перехода к рыночным отношениям.

Исходя из вышеизложенного, правительство оценивает ситуацию в экономике как сложную, однако сегодняшние трудности, с которыми приходится сталкиваться, в значительной мере — результат высокой степени зависимости от внешних факторов и трудностей переходного периода к экономике качественно нового типа.

Но выход из создавшейся ситуации есть, обнадеживает хотя бы то, что правительство не утратило управляемость финансами, экономикой, не допустило обвального спада производства, развала промышленности, сельского хозяйства, других отраслей, приступило к реализации антиинфляционной денежно-кредитной политики. На пределе финансовых возможностей правительством все же сохраняется система социальной защиты населения.

Говоря о перспективах проведения реформ в этом году, на наш взгляд, необходимо:

ускорение приватизации небольших предприятий. Так, в течение года планируется вывести из госсобственности до 50 процентов объектов торговли и услуг. Преобразовать не менее 50 крупных государственных предприятий в акционерные общества, активизировать приватизацию объектов незавершенного строительства;

проведение активной антимонопольной политики посредством расширения деятельности по выявлению естественных и искусственных монополий, их разграничение и разделение, контроль за "ценовым монополизмом";

поддержка предпринимательства путем устранения бюрократических препон и дискриминационной политики. Развитие частного сектора должно проходить максимально быстрыми темпами для того, чтобы компенсировать неизбежное сокращение производства в государственном секторе, повысить эффективность экономики и поглотить высвобождающуюся рабочую силу. Кроме этого, производство должно стремиться к переходу на выпуск только той продукции, которая пользуется реальным спросом.

Одна из наболевших проблем, которая будоражит общество и волнует всех нас, — это искоренение преступлений в экономической сфере, борьба с коррупцией.

Преступный мир становится более профессиональным, оснащается современными техническими средствами и оружием. Нельзя не видеть, что в отдельных государствах СНГ организованная преступность стала представлять собой реальную угрозу национальной безопасности и курсу проводимых реформ.

Несмотря на все наши просчеты и упущения в этом архиважном деле, пожалуй, уместным будет все же напомнить, что правительство определило борьбу с преступностью как одну из важнейших общегосударственных задач и пошло на ужесточение мер противодействия этому злу.

Прежде всего я имею в виду два постановления — от 24 сентября и 25 ноября 1992 года. Тогда это было чрезмерной мерой, но шаги правительства были поддержаны населением и, что очень важно, вами, уважаемые народные депутаты. Мы благодарны за вашу поддержку, а также за то, что в дальнейшем положения этих актов правительства нашли отражение в принятых вами законах. В этих же интересах было принято 711-е правительственное постановление по ограничению хождения иностранной валюты. Здесь также нужны ясность и понимание того, что республика на бесконтрольном хождении различных валют несет значительные убытки.

Криминогенная ситуация в республике обусловливает острую необходимость реформирования нашей правоохранительной системы, прежде всего МВД и КГБ. Важно четко разграничить их функциональные обязанности, уйти от параллелизма в их работе. При этом выскажу убеждение в том, что МВД и КГБ должны, безусловно, входить в структуру исполнительной власти, обеспечивая выполнение главной задачи — безопасности государства, защиту его суверенитета, законных прав граждан. Процесс борьбы с преступностью должен быть единым, всеохватывающим и бескомпромиссным.

Совет Министров совместно с другими заинтересованными странами заканчивает разработку Государственной программы первоочередных мер по усилению борьбы с преступностью. Реализация этих мер позволит существенно повысить эффективность работы всех правоохранительных органов, добиться коренного перелома в борьбе с преступностью.

Спору нет, действующее законодательство надо совершенствовать, в том числе уголовное, как и структуру правоохранительных органов. Но не это, на мой взгляд, главное. Суть в том, чтобы добиться твердой управляемости в государстве, четкой исполнительской дисциплины, безусловного выполнения всех решений органов государственной власти и управления. А для этого прежде всего нужно реформировать эту власть в соответствии с новыми задачами, однозначно определить компетенцию каждой из ее ветвей, обеспечить не на словах, а на деле их самостоятельность и независимость, естественно, в рамках закона. Каждый, независимо от должности, кто нарушает закон, выходит за рамки своих полномочий, должен нести безусловную ответственность. На это должна быть нацелена вся правоохранительная и судебная система.

Коренной вопрос, на котором сегодня ломаются копья в нашем парламенте, это вопрос о структуре органов государственной власти. Правительство однозначно выступает за введение поста президента — главы государства и исполнительной власти. Абсолютно беспочвенны опасения тех, кто считает, что подобный шаг может привести к узурпации власти, диктатуре и т.д. Для того, чтобы этого не случилось, в проекте Конституции, на мой взгляд, заложена довольно эффективная система сдержек и противовесов. Она базируется на мировом опыте взаимодействия и одновременно — разделения функций законодательной, исполнительной и судебной властей. Кроме того, не следует забывать и то, что для нашего народа не прошли бесследно последние годы, — годы кардинальных перемен в общественном сознании. Изменилась психология людей, повысилась их политическая активность. У нас сегодня весьма высокая степень свободы, в том числе политической. Именно свободный народ в демократическом, правовом государстве является, по моему убеждению, основным гарантом против любой узурпации власти.

Противовесом сильной исполнительной власти несомненно должна быть сильная законодательная власть, а также независимая судебная власть. На мой взгляд, в проекте новой Конституции необходимый баланс между этими властями найден. Стремясь сделать их соотношение более устойчивым, разработчики проекта предложили, например, чтобы премьер-министра, его заместителей, "силовых" министров президент назначал и освобождал с согласия Верховного Совета. Таким образом, в проекте заложено эффективное влияние Верховного Совета на деятельность правительства, подотчетного президенту.

Соотношение человека и власти — самое важное в процессе политического и экономического реформирования, который идет в Беларуси, как бы ни утверждали обратное наши оппоненты.

Закон о местном самоуправлении и местном хозяйстве, принятый в феврале 1991 года, ближе всего затрагивает интересы гражданина.

Ведь в своей повседневной жизни он общается не с парламентом и правительством, а с властью на местах — в городе, районе, на селе. И ему небезразлично, какой будет эта власть, какие у нее возможности, насколько она самостоятельна, насколько он, гражданин, в силах влиять на ее формирование и деятельность. Закон о местном самоуправлении принят, однако уже сегодня мы остро ощущаем его несовершенство, его оторванность от набирающих темп преобразований.

Этот закон не формирует баланс субъектов исполнительной власти. Это осталось за пределами компетенции Совета Министров. Однако мы считаем необходимым высказать сегодня на этот счет нашу точку зрения.

Принимаемые парламентом законы и правительственные решения зачастую не только не реализуются на местах, а, наоборот, встречают прямо-таки скрытое, а то и открытое противостояние.

Это происходит прежде всего из-за отсутствия четкой системы подчиненности государственных органов управления, размытости компетенции органов исполнительной власти, слабой реализации их управленческо-распорядительных функций, несогласованности между представительными и исполнительными органами.

Поэтому, в целях разграничения функций местных органов государственной власти и управления, укрепления ответственности должностных лиц за обеспечение государственной дисциплины, необходима коренная реорганизация всей структуры.

Правительство поддерживает идею сохранения представительной власти на местах. Как она будет называться — "местные Советы" или как-то по-иному — значения не имеет. Однако местные Советы не должны выступать в качестве местных парламентов, т.е. законодательных органов, действующих вразрез с законами единого унитарного государства. Сама жизнь подсказывает, какими функциями их следует наделить. Это прежде всего:

утверждение экономических программ и бюджетов;

установление в соответствии с законами местных налогов и сборов;

предоставление льгот по налогам и сборам, взимаемых в местные бюджеты;

распоряжение природными ресурсами в рамках, определяемых законами, вопросы охраны природы;

избрание в установленном порядке судей.

При этом Советы либо иные представительные органы есть смысл сохранить на уровне областей, районов, городов (кроме районов в городах), а в городских районах, поселках, сельских населенных пунктах иметь лишь органы исполнительной власти. Нужно, как нам кажется, решительно сокращать и численность представительных органов.

Для того, чтобы усилить управленческий потенциал всей исполнительной вертикали, мы считаем необходимым избрание председателей местных Советов, являющихся одновременно председателями исполкомов, осуществлять по представлению руководителей вышестоящих органов исполнительной власти. В частности, кандидатуры для избрания председателями облсоветов и Минского горсовета должен представлять глава исполнительной власти государства.

В таком же порядке должно осуществляться и освобождение указанных лиц от должности.

Должна быть упорядочена компетенция местных органов исполнительной власти и особенно в отношении коммунального имущества. Мы имеем сегодня немало примеров, когда местные Советы в силу специфики своей деятельности тормозят процесс приватизации, даже программы приватизации утверждают со значительным опозданием от установленных сроков.

Полагаем, что в Конституции должны быть лишь обозначены основные принципы, касающиеся местного управления и самоуправления, а компетенцию, порядок создания и деятельность органов местного самоуправления целесообразно определить специальным законом.

Позвольте теперь перейти к предложениям о совершенствовании структуры Совета Министров и его аппарата.

Несмотря на то, что правительству даны в конституционном порядке определенные полномочия, и я благодарен Верховному Совету за понимание остроты ситуации, считаю своим долгом доложить сущность проводимой реорганизации.

Поскольку мы переживаем переходный период, надо отдавать себе отчет в том, что система органов государственного управления не может сразу, в одночасье обрести стройный и законченный вид. По мере становления нашей государственности, продвижения к рынку возникает потребность в новых органах управления и ликвидации старых, отживших свое время.

Реформирование системы органов исполнительной власти — дело важное и является основным направлением нашей политики в области государственного строительства. Структура Совета Министров, сформированного Верховным Советом летом 1990 года, уже претерпела ряд изменений.

В свое время уже были упразднены министерства: легкой, местной, лесной промышленности, бытового обслуживания населения, мелиорации и водного хозяйства, строительства, монтажных и специальных строительных работ. То есть 7 министерств.

Многие их функции взяли на себя самостоятельные хозяйствующие субъекты — концерны и ассоциации. Думаю, что в ближайшее время на базе Министерства промышленности строительных материалов и Министерства строительства и эксплуатации автомобильных дорог будут созданы два новых концерна.

Существенно изменились и значительно расширились также функции некоторых ранее существовавших министерств и ведомств.

Это позволило сделать аппарат республиканских и местных органов управления более адаптированным к современным условиям. Хотя он и несколько вырос, но все же не выглядит таким уж громоздким, как это порой представляется. Численность его не превышает 1,3 процента от занятых в народном хозяйстве, в то время как в Литве этот показатель равен 1,8 процента, на Украине — 1,4 процента.

Фактически расходы на содержание аппарата в прошлом году в общей сумме расходов по республиканским затратам составили 1,21 процента против 1,31 процента, утвержденных в бюджете.

Главная цель преобразований системы управления заключается в том, чтобы полностью уйти от прямого централизованного административного воздействия на различные стороны хозяйствования, предоставить возможность хозяйствующим субъектам действовать самостоятельно, иначе говоря — создать качественно новый аппарат управления на принципах, принятых в мире. Одновременно мы ставим задачу сохранить государственное регулирование на государственную собственность.

В республиканской структуре управления центральное место должно быть отведено министерству. Оно должно стать активным проводником политики правительства в той или иной сфере и обладать для этого самыми широкими полномочиями. Его необходимо максимально освободить от оперативно-распорядительных функций.

Число министерств должно быть небольшим, но позволяющим охватить своим влиянием весь круг проблем на макроуровне. В связи с этим нужно укрупнить блоки государственного управления, расширить компетенцию министерств по принятию нормативных актов.

Поэтому правительство уже значительно расширило полномочия руководителей министерств и ведомств, предоставив им больше самостоятельности в совершенствовании структуры центральных аппаратов, в управлении имуществом, в создании целевых фондов за счет бюджетных и внебюджетных источников финансирования, во внедрении новых форм найма на работу.

Не буду подробно останавливаться на всех предложенных изменениях, доложу лишь о самых главных.

Прежде всего это преобразование Госэкономплана в Министерство экономики. Это не просто смена названия или дань моде. Дело в том, что сегодняшний статус этого ведомства не соответствует его задачам. Минэкономики должно сосредоточиться на разработке общегосударственных экономических программ, прогнозировании важнейших экономических процессов, реализации рыночных реформ. Иными словами, оно должно взять на себя роль регулятора экономической жизни в республике.

Структура и функционирование этого министерства должны реализовывать задачи двойного содержания. С одной стороны: обеспечить управляемость всего государственного комплекса, с другой — генерировать экономическую политику на пути к рыночным реформам.

Чтобы осуществить такой замысел, мы рассчитываем при Минэкономики создать независимый центр экономических реформ, в работе которого будут принимать участие: ученые экономисты; руководители производств; предприниматели и представители других заинтересованных сторон.

С учетом повышения значения контроля за энергоресурсами и необходимости концентрации управления этой областью в одном конкретном ведомстве мы считаем целесообразным на базе Минэнерго и Комитета по нефти и химии при Совете Министров сформировать Министерство топлива и энергетики. Таким образом, весь комплекс вопросов энерго-топливного обеспечения будет координировать одна правительственная структура.

Считаем необходимым преобразование Государственного комитета по внешним экономическим связям в соответствующее министерство. Значительно возросшие функции этого внешнеэкономического ведомства требуют адекватного повышения его статуса. Это министерство должно стать одним из важных министерств в области внешнеэкономических отношений. Оно должно учитывать важность привлечения в республику валюты и инвестиций.

В целях усиления влияния Министерства финансов на всю финансовую систему республики в его ведение передаются функции ряда органов, в том числе Госинспекции по ценным бумагам, Госстрахнадзора, Гознака. Весьма важным является создание в Министерстве финансов Государственного казначейства, в котором будут сосредоточены все средства бюджета и государственных внебюджетных фондов.

Далее, Госкомимущество преобразуется в Министерство по управлению государственным имуществом и приватизации. Госкомэкологии — в Министерство природных ресурсов и охраны окружающей среды с образованием при нем Департамента рыбоохраны на базе Главного управления по охране и воспроизводству рыбных запасов и регулированию рыболовства при Совете Министров.

С упразднением Минресурсов на базе его предприятий и организаций создается акционерное общество.

Функции Минхлебопродуктов, которое также упраздняется, передаются Минсельхозпроду.

На базе двух министерств, информации и культуры, создается одно — Министерство культуры и печати.

Национальная государственная телерадиокомпания преобразовывается в Государственный комитет по телевидению и радиовещанию.

Комитет по социальной защите военнослужащих ликвидируется, а его функции передаются соответственно Министерству культуры и печати, Госкомтруду и Минобороны.

Планируется создание Комитета по науке и технике, на который будут возложены полномочия по научному обеспечению проводимых реформ.

В целом намечено сократить 13 министерств и ведомств. Это почти четвертая часть от их нынешнего общего количества.

Центральные аппараты министерств и ведомств предусматривается сократить на 12 процентов (800 человек) от их численности. Экономия от этого с учетом действующей в декабре 1993 года оплаты труда в расчете на год составит около полутора миллиардов рублей.

Теперь несколько слов об аппарате правительства. Изменения в структуре государственного управления, естественно, влекут за собой его реорганизацию.

В связи с этим функции отраслевых управлений и отделов резко сужаются и в большей мере переходят к министерствам, расширяя их управленческую самостоятельность.

В соответствии с новыми подходами и той самостоятельностью, которой будут теперь наделены министерства, в правительственном аппарате упраздняется ряд управлений и отделов отраслевой направленности.

Одновременно будут созданы другие структуры. Так, при Председателе Совета Министров будет создан Совет независимых экспертов. Кстати, такой подход поддерживает Конфедерация промышленников и предпринимателей. Полагаю, что это позволит более глубоко анализировать социально-экономическую ситуацию, оперативно и с высокой степенью точности принимать правительственные решения.

Вводятся новые должности, соответствующие новым задачам, повышается роль и ответственность советников. Будет реформироваться служба информации правительства.

В целом аппарат Совета Министров сокращается на 10 процентов, что по заработной плате по состоянию на декабрь текущего года составит в пересчете на год около 100 миллионов рублей экономии.

Численность сотрудников аппарата сократится более чем на одну треть и будет в пределах 200 человек.

Я уверен, что с реорганизацией органов государственного управления, аппарата Совета Министров в эти структуры придут новые, свежие силы, высокопрофессиональные и честные люди. Мы надеемся, что этому будет способствовать и реализация Закона об основах службы в государственном аппарате, который вступил в силу с 1 марта этого года.

Что касается сокращения численности областных, городских и других Советов и аппаратов работников при них, Верховный Совет, как известно, на этот счет дал поручение правительству. Однако при существующем законодательстве Совет Министров не имеет необходимых полномочий унифицировать и сократить до оптимальной численности их состав. На сегодня сложилось такое положение, что количество всех работающих в одном, скажем, облсовете и исполкоме на 150—200 человек больше, чем в другом. В связи с этим правительство вносит предложение обсудить этот вопрос на сессии или на Президиуме Верховного Совета, найти целесообразную единую конструкцию местных органов власти при обязательном сокращении численности их аппарата на 12—15 процентов.

Уважаемые народные депутаты!

Я постарался очень коротко изложить позицию правительства по основным вопросам жизни и деятельности нашего государства. Надеюсь, что наш подход найдет взаимопонимание у большинства из вас и в результате будут приняты такие решения, которые позволят нам более решительно и эффективно осуществлять наше государственное строительство, реформировать органы власти и управления, создавать социально ориентированную рыночную экономику.

Сегодня мы переживаем трудное время. Однако не следует излишне драматизировать ситуацию. У нас есть самое главное, самое важное — стойкий, трудолюбивый народ, прекрасно образованная, высокоинтеллектуальная научно-техническая и творческая интеллигенция. У нас есть ясная и благородная цель — создание для народа Беларуси достойных условий жизни, стремление привести республику к благополучию и процветанию. Ради достижения этой цели правительство будет действовать решительно и бескомпромиссно.

Что касается более предметного рассмотрения экономических проблем, то было бы целесообразно возвратиться к ним отдельно после подписания белорусско-российских документов и при рассмотрении вопроса о кредитно-финансовой политике, который внесен в повестку дня.

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб адходах вытворчасці і спажывання

Закон заклікаючы садзейнічаць прадухіленню адмоўнага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе і чалавека пры абыходжанні з адходамі і максімальнаму ўключэнню іх у гаспадарчы абарот як дадатковай крыніцы сыравіны.

Артыкул 1. Вызначэнне паняццяў

У гэтым Законе выкарыстоўваюцца наступныя паняцці і іх азначэнні:

адходы вытворчасці — астаткі сыравіны, матэрыялаў, паўфабрыкатаў, якія ўтвараюцца ў працэсе вытворчасці прадукцыі або выканання работ і страцілі поўнасцю або часткова зыходныя спажывецкія якасці, а таксама спадарожныя рэчывы, што ўтвараюцца ў працэсе вытворчасці і не знаходзяць прымянення ў гэтай вытворчасці. У адходы вытворчасці ўключаюцца ўтрымальныя і раскрыўныя пароды, якія ўтвараюцца пры здабыванні карысных выкапняў, пабочныя і спадарожныя прадукты;

адходы спажывання — вырабы і матэрыялы, страціўшыя свае спажывецкія ўласцівасці ў выніку фізічнага ці маральнага іх зносу. Да адходаў спажывання належаць і цвёрдыя бытавыя адходы, якія ўтвараюцца ў выніку жыццядзейнасці людзей;

небяспечныя адходы — адходы, якія ў выніку іх рэакцыйнай здольнасці або таксічнасці ствараюць непасрэдную ці патэнцыяльную небяспеку для здароўя чалавека або стану навакольнага асяроддзя самастойна ці пры ўступленні ў кантакт з іншымі рэчывамі (адходамі) і навакольным асяроддзем;

абыходжанне з адходамі — вытворчасць, апрацоўка, упакоўка, захоўванне (складзіраванне), транспарціроўка, назапашванне, выкарыстанне, разбурэнне, пераўтварэнне, падрыхтоўка да продажу, захаванне або іншыя падобныя дзеянні;

рэкуперацыя адходаў — атрыманне зноў рэчыва, якое ўтрымліваецца ў адходах вытворчасці, выкарыстанне цяпла хімічных рэакцый;

трансгранічная перавозка — любое перамяшчэнне адходаў з раёна, які знаходзіцца пад нацыянальнай юрысдыкцыяй іншай дзяржавы, у раён або праз раён, што знаходзіцца пад нацыянальнай юрысдыкцыяй Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 2. Сфера прымянення Закона

Гэты Закон распаўсюджваецца на ўсіх суб'ектаў гаспадарання незалежна ад форм уласнасці, якія ажыццяўляюць дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь незалежна ад грамадзянства і тэрміну пражывання.

Закон рэгулюе адносіны, што ўзнікаюць у працэсе работы з адходамі пры:

распрацоўцы радовішчаў карысных выкапняў і перапрацоўцы мінеральнай сыравіны;

вытворчасці, транспарціроўцы і захоўванні прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння, тавараў народнага спажывання, энергіі і энерганосьбітаў;

вытворчасці будаўнічых, сельскагаспадарчых, горных і іншых работ, а таксама пры аказанні розных паслуг;

фізічным і маральным зносе асноўных і абаротных сродкаў;

спажыванні насельніцтвам прамысловых і харчовых тавараў.

Пры выкарыстанні і выдаленні радыеактыўных адходаў, асадкаў сцёкавых вод павінны захоўвацца як патрабаванні дадзенага Закона, так і спецыяльных актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 3. Кампетэнцыя Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у галіне абыходжання з адходамі

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь у галіне абыходжання з адходамі:

заканадаўча забяспечвае эканамічнае стымуляванне збору і перапрацоўкі адходаў;

ажыццяўляе міждзяржаўнае супрацоўніцтва ў галіне абыходжання з адходамі;

распрацоўвае і прымае заканадаўчыя акты ў галіне абыходжання з адходамі;

па прадстаўленню кампетэнтных органаў і ўзгадненню з мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў ажыццяўляе адвод зямельных участкаў пад месцы складзіравання (размяшчэння), захавання і перапрацоўкі адходаў;

разглядае іншыя пытанні ў галіне абыходжання з адходамі.

Артыкул 4. Кампетэнцыя мясцовых Саветаў народных дэпутатаў у галіне абыходжання з адходамі

Да кампетэнцыі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў у галіне абыходжання з адходамі адносяцца:

арганізацыя і каардынацыя дзейнасці ўсіх прадпрыемстваў і арганізацый, якія знаходзяцца на іх тэрыторыі, з мэтай выяўлення адходаў і ўключэння іх у гаспадарчы абарот;

аб'яднанне пры неабходнасці і мэтазгоднасці сродкаў юрыдычных асоб, грамадзян, мясцовага бюджэту і пазабюджэтных фондаў для фінансавання будаўніцтва новых, расшырэння і рэканструкцыі дзеючых аб'ектаў па апрацоўцы, перапрацоўцы другаснай сыравіны;

арганізацыя ліквідацыі адходаў за кошт іх уладальнікаў разам з прад'яўленнем запатрабаванняў аб пакрыцці шкоды, прычыненай навакольнаму асяроддзю адходамі вытворчасці і спажывання;

забеспячэнне насельніцтва інфармацыяй па абыходжанню з адходамі, стану іх захоўвання і перапрацоўкі ў рэгіёне;

вырашэнне іншых пытанняў у галіне абыходжання з адходамі, аднесеных да кампетэнцыі органаў мясцовага самакіравання заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Мясцовыя Саветы народных дэпутатаў могуць дэлегаваць частку сваіх паўнамоцтваў у галіне абыходжання з адходамі органам Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі.

Артыкул 5. Кампетэнцыя Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне абыходжання з адходамі

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне абыходжання з адходамі:

арганізуе і плануе работы па збору, перапрацоўцы, складзіраванню ўсіх відаў адходаў;

каардынуе дзейнасць міністэрстваў, дзяржаўных камітэтаў, іншых падведамных яму органаў у галіне абыходжання з адходамі;

зацвярджае палажэнне аб парадку абыходжання з адходамі, выдае дазвол на іх трансгранічныя перавозкі з улікам зместу артыкула 11;

зацвярджае парадак распрацоўкі лімітаў на размяшчэнне адходаў;

па прадстаўленню Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі ўстанаўлівае нарматывы платы за размяшчэнне адходаў;

распрацоўвае і зацвярджае палажэнне аб парадку выдачы суб'ектам гаспадарання дазволаў на захаванне і перапрацоўку адходаў і зацвярджае памер платы за выдачу гэтых дазволаў (ліцэнзій);

прымае канчатковае рашэнне аб размяшчэнні і развіцці аб'ектаў па выкарыстанню і захаванню адходаў пры нязгодзе на тое мясцовых Саветаў пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню пры ўмове захавання экалагічных і іншых сацыяльна-значных нарматываў;

ажыццяўляе міжурадавае супрацоўніцтва ў галіне абыходжання з адходамі;

рэгулюе іншыя пытанні ў галіне абыходжання з адходамі.

Артыкул 6. Кампетэнцыя Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі і яго органаў у галіне абыходжання з адходамі

Да кампетэнцыі Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі і яго органаў адносяцца:

кантроль за дзейнасцю міністэрстваў, прадпрыемстваў, установ у галіне абыходжання з адходамі;

выдача іануляванне дазволаў на захоўванне (складзіраванне) прамысловых, камунальна-бытавых і іншых адходаў;

устанаўленне па ўзгадненню з органамі дзяржаўнага санітарнага нагляду максімальных працэнтаў утрымання ў адходах рэкуперавальных матэрыялаў і рэчываў, якія павінны захоўвацца пры вытворчасці;

узгадненне выдачы ліцэнзій на правядзенне міждзяржаўных аперацый па абыходжанню з адходамі;

абмежаванне або прыпыненне дзейнасці суб'ектаў гаспадарання незалежна ад форм уласнасці, калі гэта дзейнасць ажыццяўляецца з парушэннем заканадаўства па абыходжанню з адходамі;

распрацоўка нарматываў платы за размяшчэнне адходаў;

зацвярджэнне пераліку небяспечных адходаў;

ажыццяўленне на адпаведным узроўні міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне абыходжання з адходамі, вывучэнне, абагульненне і распаўсюджванне міжнароднага вопыту, кантроль за выкананнем абавязацельстваў Рэспублікі Беларусь па міжнародных пагадненнях у галіне абыходжання з адходамі.

Рашэнні Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі ў галіне абыходжання з адходамі па пытаннях, аднесеных да яго кампетэнцыі, абавязковыя для ўсіх суб'ектаў гаспадарання і могуць быць абскарджаны ў судовым парадку.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

ПОПРАВКА

В номере за 1 марта с.г. в опубликованном на 3-й странице постановлении Совета Министров N 102 заголовок следует читать "О кредитовании кооперативного и индивидуального жилищного строительства".

Народная газета

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб адходах вытворчасці і спажывання

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Артыкул 7. Кампетэнцыя іншых спецыяльна на тое ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў у галіне абыходжання з адходамі

Кампетэнцыя іншых спецыяльна на тое ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў у галіне абыходжання з адходамі вызначаецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і палажэннямі аб іх дзейнасці.

Артыкул 8. Улік утварэння і выкарыстання адходаў

Суб'екты гаспадарання ажыццяўляюць улік і прадстаўляюць органам статыстыкі і Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі справаздачу аб наяўнасці, утварэнні і выкарыстанні адходаў уласнай вытворчасці, а таксама адходаў, якія паступаюць з боку, у парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 9. Планаванне выкарыстання адходаў

Дзяржаўнымі камітэтамі Рэспублікі Беларусь па экалогіі, эканоміцы і планаванню, Міністэрствам рэсурсаў Рэспублікі Беларусь сумесна з зацікаўленымі міністэрствамі і ведамствамі, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам, аб'яднаннямі, прадпрыемствамі і арганізацыямі распрацоўваюцца праграмы экалагічна і эканамічна абгрунтаванага выкарыстання адходаў, якія зацвярджаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Праграма з'яўляецца зыходным дакументам для стварэння сістэмы ўзаемазвязаных навукова-тэхнічных, арганізацыйна-эканамічных і сацыяльных мерапрыемстваў, якія забяспечваюць уключэнне адходаў у гаспадарчы абарот.

Артыкул 10. Парадак захоўвання (складзіравання), перапрацоўкі і захавання адходаў

Забараняецца скідванне адходаў у сістэмы водаадводу, водныя аб'екты, балоты, водаахоўныя зоны вадаёмаў і вадацёкаў, рэкрэацыйныя зоны, зоны санітарнай аховы крыніц водазабеспячэння і водаправода, на тэрыторыі запаведнікаў, заказнікаў, нацыянальных паркаў і ахоўных зон.

Забараняецца захаванне небяспечных адходаў на тэрыторыі гарадоў, іншых населеных пунктаў, у водных аб'ектах, падземных ваданосных гарызонтах, курортна-аздараўленчых зонах і іншых месцах, дзе можа быць створана небяспека пагаршэння стану навакольнага асяроддзя і здароўя насельніцтва.

Размяшчэнне адходаў вытворчасці і спажывання ў навакольным асяроддзі з'яўляецца платным. Нарматывы платы і парадак збірання ўстанаўліваюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі.

За размяшчэнне адходаў звыш устаноўленых лімітаў плата бярэцца ў пяцікратным памеры.

Захоўванне (складзіраванне), перапрацоўка і захаванне адходаў праводзяцца толькі ў дазволеных месцах і на дазволеных аб'ектах у адпаведнасці з патрабаваннямі, якія ўстанаўліваюцца Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па экалогіі па ўзгадненню з іншымі спецыяльна на тое ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі.

Парадак часовага захоўвання адходаў на тэрыторыі прадпрыемстваў устанаўліваецца органамі Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі па ўзгадненню з органамі дзяржаўнага санітарнага нагляду.

Артыкул 11. Трансгранічная перавозка адходаў

Трансгранічная перавозка адходаў ажыццяўляецца толькі ў выключных выпадках і рэгулюецца спецыяльным палажэннем, якое зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 12. Фінансаванне мерапрыемстваў па выкарыстанню, захоўванню (складзіраванню), захаванню адходаў

Фінансаванне мерапрыемстваў па экалагічна абгрунтаванаму выкарыстанню, захоўванню (складзіраванню), захаванню адходаў ажыццяўляецца за кошт:

рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў;

сродкаў юрыдычных асоб, якія перадаюць адходы на аб'екты па іх выкарыстанню і захаванню;

рэспубліканскага і мясцовых пазабюджэтных фондаў аховы прыроды;

крэдытаў банкаў.

Артыкул 13. Эканамічнае стымуляванне выкарыстання адходаў

Эканамічнае стымуляванне выкарыстання адходаў уключае:

устанаўленне льготных расцэнак за збор і нарыхтоўку другаснай сыравіны і прадукты яе перапрацоўкі;

выдзяленне сродкаў з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў для выканання мерапрыемстваў па выкарыстанню адходаў;

ільготнае крэдытаванне і падаткаабкладанне суб'ектаў гаспадарання, якія выкарыстоўваюць у якасці сыравіны адходы.

Парадак ажыццяўлення мер, звязаных з эканамічным стымуляваннем выкарыстання адходаў, вызначаецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 14. Абавязкі суб'ектаў гаспадарання ў галіне абыходжання з адходамі

Суб'екты гаспадарання пры абыходжанні з адходамі абавязаны:

укараняць экалагічна чыстыя, малаадходныя і безадходныя тэхналогіі;

экалагічна абгрунтавана выкарыстоўваць адходы;

праводзіць лабараторны кантроль за якасцю навакольнага асяроддзя ў месцах складзіравання і часовага захоўвання адходаў;

пакрываць у поўным аб'ёме шкоду, прычыненую навакольнаму асяроддзю, здароўю і маёмасці грамадзян і асоб без грамадзянства, юрыдычным асобам пры парушэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне абы- [illegible]

прадастаўляць любую інфармацыю па пытаннях утварэння і абыходжання з адходамі. Пры гэтым суб'екты гаспадарання нясуць устаноўленую заканадаўствам адказнасць за наўмыснае прадастаўленне няпоўнай, навукова неабгрунтаванай і недакладнай інфармацыі;

неадкладна апавяшчаць Штаб грамадзянскай абароны, выканкамы мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, органы Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі і дзяржаўнага санітарнага нагляду аб выпадках пападання небяспечных адходаў у навакольнае асяроддзе і прынятых у сувязі з гэтым мерах;

забяспечваць адходы, што транспартуюцца і захоўваюцца, этыкеткамі, якія маюць: знак, што абазначае клас небяспекі; поўную назву адходаў; іх агрэгатны стан, колер, пах; пажаравыбуховабяспечныя ўласцівасці; від упакоўкі; назву працэсу, пры якім атрыманы адходы; спецыяльныя патрабаванні пры абыходжанні з імі, у тым ліку пры аварыях; адрас прадпрыемства, арганізацыі, дзе атрыманы адходы;

пры трансгранічных перавозках адходаў кіравацца патрабаваннямі гэтага Закона і спецыяльнага палажэння, якое зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 16. Міжнародныя дагаворы

Калі міжнародным дагаворам, заключаным Рэспублікай Беларусь, устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія змяшчаюцца ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь аб адходах вытворчасці і спажывання, то прымяняюцца нормы міжнароднага дагавора.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

25 лістапада 1993 г.
г.Мінск.
№ 2609-XII

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб Дзяржаўным бюджэце Рэспублікі Беларусь на 1994 год

Паказчыкі Дзяржаўнага бюджэту Рэспублікі Беларусь на 1994 год распрацаваны зыходзячы з прагнозных ацэнак вытворчай і іншай дзейнасці прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый і ўстаноў, прадугледжаных эканамічнай праграмай урада Рэспублікі Беларусь на наступны год. Даходы і расходы бюджэту вызначаны з улікам рашэнняў, прынятых на трынаццатай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь пры абмеркаванні пытанняў аб эканамічнай палітыцы і шляхах выхаду рэспублікі з крызісу, росту цэн і тарыфаў ва ўмовах рыначных адносін, змяненняў падатковага заканадаўства, паэтапнага скарачэння субсідый і датацый на асобныя віды прадукцыі (работ і паслуг). У адпаведнасці з прынятымі заканадаўчымі і іншымі нарматыўнымі актамі ў бюджэце прадугледжаны асігнаванні на сацыяльную абарону малазабяспечаных слаёў насельніцтва, прыярытэтнае развіццё сацыяльнай сферы, фінансавую падтрымку асобных галін гаспадаркі, іншыя мерапрыемствы, звязаныя з функцыянаваннем эканомікі.

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:

Артыкул 1. Устанавіць, што гранічны памер дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту на 1994 год не можа перавышаць 6 працэнтаў ад валавога ўнутранага прадукту.

Мясцовыя бюджэты ўсіх узроўняў на 1994 год зацвярджаюцца без дэфіцытаў. Для забеспячэння фінансавання расходаў па ўказаных бюджэтах, якія не пакрываюцца замацаванымі за імі даходамі і адлічэннямі ад агульнарэспубліканскіх і іншых падаткаў і даходаў, выдзяляюцца датацыі з бюджэтаў вышэйстаячага ўзроўню ў памерах, што ўстанаўліваюцца адпаведна Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь і мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў.

Артыкул 2. Устанавіць, што даходы рэспубліканскага бюджэту на 1994 год фарміруюцца за кошт:

адлічэнняў ад падатку на дабаўленую вартасць (за выключэннем адлічэнняў, якія перадаюцца ў мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска ў памерах, прадугледжаных пунктам "б" артыкула 11 гэтага Закона);

адлічэнняў ад акцызаў у памеры 70 працэнтаў;

адлічэнняў ад падатку на прыбытак і падатку на даходы прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый (за выключэннем прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый камунальнай уласнасці, грамадскіх арганізацый, прадпрыемстваў і арганізацый спажывецкай кааперацыі, іншых кааператываў, а таксама іншых прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый мясцовай гаспадаркі, што выплачваюць гэтыя падаткі поўнасцю ў мясцовыя бюджэты) у памеры 80 працэнтаў;

надзвычайнага падатку для фінансавання расходаў па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС;

падатку на нерухомасць прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый, якія адносяцца да рэспубліканскай уласнасці, іншых прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый, за выключэннем прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый, якія выплачваюць гэты падатак у адпаведнасці з часткай першай артыкула 12 гэтага Закона ў мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска;

іншых падаткаў, даходаў і непадатковых паступленняў, за выключэннем адлічэнняў, якія выплачваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам у мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска.

Артыкул 3. Зацвердзіць рэспубліканскі бюджэт на 1994 год па даходах у суме 8830429,9 млн.рублёў.

Артыкул 4. Устанавіць даходы рэспубліканскага бюджэту на 1994 год:

	(млн.рублёў)
Падатак на дабаўленую вартасць	1814558,2
Акцызы	2090484,2
Падатак на прыбытак і падатак на даходы	2629727,2
Даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці	85400,0
Падатак на карыстанне прыроднымі рэсурсамі	10292,0
Падатак на паліва	469987,0
Падатак на нерухомасць	69823,0
Даходы ад прыватызацыі рэспубліканскай уласнасці	287618,0
Плата за зямлю	59860,7
Надзвычайны падатак для фінансавання расходаў па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС	646537,0
[illegible]	280051,0
Іншыя даходы і непадатковыя паступленні	386591,8

Артыкул 5. Устанавіць, што сродкі рэспубліканскага бюджэту накіроўваюцца ў 1994 годзе на забеспячэнне функцыянавання галін народнай гаспадаркі, якія знаходзяцца ў кіраванні рэспубліканскіх органаў, на фінансаванне фундаментальных і навуковых даследаванняў і тэхнічных распрацовак, сацыяльна-культурных устаноў і мерапрыемстваў агульнарэспубліканскага значэння і сацыяльнай абароны насельніцтва, мерапрыемстваў па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, абарону, праваахоўчых органаў, судовых органаў і органаў пракуратуры, рэспубліканскіх органаў улады і кіравання, стварэнне неабходных фінансавых рэзерваў, іншых расходаў агульнарэспубліканскага значэння, выдачу датацый мясцовым бюджэтам абласцей.

Артыкул 6. Зацвердзіць рэспубліканскі бюджэт на 1994 год па расходах у суме 11311626,5 млн.рублёў.

Артыкул 7. Устанавіць у рэспубліканскім бюджэце на 1994 год асігнаванні на:

	(млн.рублёў)
Фінансаванне народнай гаспадаркі	1957116,0
У тым ліку на:	
дзяржаўныя капітальныя ўкладанні	293402,8
дзяржаўную датацыю	67770,0
пакрыццё розніцы ў цэнах	42865,4
выплату надбавак да закупачных цэн	199584,0
геолагаразведачныя і тапографа-геадэзічныя работы	56440,0
будаўніцтва, рамонт і ўтрыманне аўтамабільных дарог (за кошт паступлення сродкаў па падатку на паліва)	469987,0
расходы па фінансаванню рэспубліканскіх комплексных праграм па харчаванню і забеспячэнню аграрнай рэформы	277331,8
дзяржаўную падтрымку сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак	32500,0
інвестыцыйнае крэдытаванне	381045,0
апераціўныя і іншыя расходы	135890,0
Расходы, звязаныя з знешнеэканамічнай дзейнасцю	825268,2
Фінансаванне сацыяльна-культурных устаноў і мерапрыемстваў	2190182,1
У тым ліку на:	
народную адукацыю і падрыхтоўку кадраў	513432,9
культуру і сродкі масавай інфармацыі	131898,5
ахову здароўя	821973,0
фізічную культуру	31165,7
сацыяльнае забеспячэнне	345857,0
фінансаванне праграм сацыяльных гарантый	60250,0
расходы, звязаныя з утрыманнем жыллёвага ўзроўню насельніцтва	285605,0
Фінансаванне навукі	157192,2
Расходы на абарону (уключаючы пагранічныя і чыгуначныя войскі, абаронныя спартыўна-тэхнічныя таварыствы, штаб і войскія часці грамадзянскай абароны)	761740,0
Утрыманне органаў унутраных спраў (уключаючы ўнутраныя войскі)	282053,0
Утрыманне папраўча-працоўных устаноў	94198,0
Утрыманне органаў дзяржаўнай бяспекі	41136,0
Утрыманне судовых органаў	20994,2
Утрыманне органаў пракуратуры	14438,7
Утрыманне мытных органаў	41663,9
Іншыя мерапрыемствы	648809,3
Утрыманне органаў дзяржаўнай улады і кіравання	132996,2
Рэзервовы фонд Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь	55223,2
Рэзерв міністра фінансаў Рэспублікі Беларусь	2833,4
Фонд стабілізацыі эканомікі	44178,7
Расходы па абслугоўванню дзяржаўнага ўнутранага доўгу і выдадзеных пазык пад гарантыю бюджэту	631622,0
Расходы на правядзенне выбараў	39892,7
Расходы па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС	1628291,0
Бюджэтныя пазыкі, дэпазіты, паявыя ўзносы	200000,0
Сродкі для павелічэння абаротнай касавай наяўнасці	40000,0
Іншыя расходы	415015,5
Датацыі мясцовым бюджэтам абласцей	1086782,2.

Артыкул 8. Зацвердзіць абаротную касавую наяўнасць па рэспубліканскаму бюджэту на 1 студзеня 1995 года ў суме 43490,8 млн.рублёў.

Артыкул 9. Устанавіць у адпаведнасці з артыкулам 18 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі" ніжнюю мяжу агульных затрат на навукова-даследчую дзейнасць у памеры 1,5 працэнта ад даходнай часткі рэспубліканскага бюджэту і нарматыў аб'ёму фінансавання фундаментальных і пошукавых даследаванняў у памеры 29,9 працэнта да агульнага аб'ёму бюджэтных асігнаванняў на навукова-даследчыя і вопытна-канструктарскія работы.

Артыкул 10. Устанавіць на 1994 год надзвычайны падатак у памеры 12 працэнтаў ад фонду аплаты працы ўсіх прадпрыемстваў, аб'яднанняў і гаспадарчых арганізацый, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (за выключэннем калгасаў, саўгасаў, сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак, міжгаспадарчых прадпрыемстваў і арганізацый, сельскагаспадарчых кааператываў, падсобных сельскіх гаспадарак прамысловых прадпрыемстваў і іншых сельскагаспадарчых фарміраванняў незалежна ад форм уласнасці ў частцы фонду аплаты працы па рэалізацыі выробленай імі прадукцыі раслінаводства (акрамя кветак, дэкаратыўных раслін), жывёлагадоўлі (акрамя пушной зверагадоўлі), рыбаводства і пчалярства, з аднясеннем яго на сабекошт прадукцыі, работ і аказаных паслуг і накіраваннем сумы гэтага падатку на фінансаванне мерапрыемстваў па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь устанавіць парадак выплаты надзвычайнага падатку прадпрыемствамі, аб'яднаннямі і арганізацыямі.

Артыкул 11. Зацвердзіць на 1994 год нарматывы адлічэнняў (у працэнтах) у мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска:

а) ад акцызаў — 30;

б) ад падатку на дабаўленую вартасць — 50, за выключэннем мясцовых бюджэтаў горада Мінска; у мясцовыя бюджэты горада Мінска зацвердзіць нарматыў адлічэнняў — 25;

в) ад падатку на прыбытак і падатку на даходы прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый (за выключэннем прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый камунальнай уласнасці, грамадскіх арганізацый, прадпрыемстваў і арганізацый спажывецкай кааперацыі, іншых кааператываў, а таксама іншых прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый мясцовай гаспадаркі, што выплачваюць гэтыя падаткі поўнасцю ў мясцовыя бюджэты) — 20.

Артыкул 12. Устанавіць, што падатак на нерухомасць, які выплачваецца прадпрыемствамі, аб'яднаннямі і арганізацыямі камунальнай уласнасці, грамадскімі арганізацыямі, прадпрыемствамі і арганізацыямі спажывецкай кааперацыі, іншымі кааператывамі, а таксама іншымі прадпрыемствамі, аб'яднаннямі і арганізацыямі мясцовай гаспадаркі, фізічнымі асобамі, у 1994 годзе поўнасцю залічваецца ў мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска.

Сродкі ад прыватызацыі камунальнай уласнасці поўнасцю залічваюцца ў даход бюджэту адпаведнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўтварэння.

Артыкул 13. Устанавіць, што іншыя падаткі, даходы і непадатковыя паступленні залічваюцца ў мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 14. Устанавіць на 1994 год датацыі з рэспубліканскага бюджэту мясцовым бюджэтам Брэсцкай вобласці — 258277,1 млн.рублёў, Віцебскай вобласці — 138648,9 млн.рублёў, Гомельскай вобласці — 13332,6 млн.рублёў, Гродзенскай вобласці — 278795,9 млн.рублёў, Мінскай вобласці — 284080,4 млн.рублёў і Магілёўскай вобласці — 113647,3 млн.рублёў.

Артыкул 15. Устанавіць, што на 1994 год памер прыросту ўнутранага дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь не можа перавышаць 6 працэнтаў ад валавога ўнутранага прадукту.

Устанавіць на 1994 год ліміт удзелу Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь у крэдытаванні рэспубліканскага бюджэту ў памеры 4 працэнтаў ад валавога ўнутранага прадукту.

Устанавіць на 1994 год гранічны памер платы за абслугоўванне Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь дзяржаўнага ўнутранага доўгу, уключаючы крэдыты, выдадзеныя на пакрыццё дэфіцыту бюджэту, — 6,5 працэнта гадавых.

